ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ГІСТОРЫЯ
HISTORY

УДК [94(476):373.5]“1945/1947”
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-295-301

Паступіў у рэдакцыю 08.06.2026
Received 08.06.2026

І. А. Андарала

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь

УМОВЫ ПАЎСЯДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ І ПРАЦЫ НАСТАЎНІКАЎ БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯАКУПАЦЫЙНЫЯ І ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1943–1947 гг.)

Аннотация. На основе изучения комплекса нормативно-правовых документов и архивных источников в сочетании с конструктивным обобщением научных публикаций советской и постсоветской историографии анализируются и характеризуются условия повседневной жизни и педагогической работы учителей Беларуси после освобождения территории республики от фашистских оккупантов и в первые послевоенные годы. Показана несовершенность механизма реализации местными органами власти социальной политики государства в отношении улучшения материального положения учителей: не были созданы благоприятные жилищные и элементарные бытовые условия, отсутствовала своевременная оплата труда, имело место недостаточное обеспечение продуктами питания и промышленными товарами.

Ключевые слова: послевоенные годы, общеобразовательная школа, учителя, материальное положение, жилищно-бытовые условия, заработная плата, обеспечение продуктами питания и промышленными товарами

Для цитирования: Андарала, І. А. Умовы паўсядзённага жыцця і працы настаўнікаў Беларусі ў пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады (1943–1947 гг.) / І. А. Андарала // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2026. – Т. 71, № 4. – С. 295–301. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-295-301

Ihor A. Andarala

Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus

CONDITIONS OF EVERYDAY LIFE AND WORK OF TEACHERS IN BELARUS IN THE POST-OCCUPANCY AND FIRST POST-WAR YEARS (1943–1947)

Abstract. This article analyzes and characterizes the daily living and teaching conditions of Belarusian teachers after the liberation of the republic from the occupiers and in the first post-war years, based on a comprehensive study of regulatory documents and archival sources, combined with a constructive summary of Soviet and post-Soviet historiographic publications. It also examines the limitations of the local government’s implementation of state social policy to improve teachers’ financial situation, including the creation of favorable housing and basic living conditions, timely payment of wages, and provision of food and industrial goods.

Keywords: post-war years, comprehensive school, teachers, financial situation, housing and living conditions, wages, provision of food and industrial goods

For citation: Andarala I. A. Conditions of everyday life and work of teachers in Belarus in the post-occupancy and first post-war years (1943–1947). *Vestsi Natsyyanal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2026, vol. 71, no. 4, pp. 295–301 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-295-301

Уводзіны. На працягу ўсёй савецкай гісторыі адным з самых масавых слаёў беларускай інтэлігенцыі, якая актыўна ўдзельнічала ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці беларускай рэспублікі і грамадства, было настаўніцтва. Не з’явіліся выключэннем і пасляваенныя гады. У складаных умовах пасляваеннай разрухі настаўнікі, не шкадуючы ні сіл, ні часу, патрыятычна выконвалі свой прафесійны абавязак і прымалі ўдзел у грамадска-палітычным і куль-

© Андарала І. А., 2026

турна-гаспадарчым жыцці рэспублікі. Яны арганізоўвалі школьнікаў і іх бацькоў на суботнікі і нядзельнікі па рамонце школьных памяшканняў, нарыхтоўцы паліва, уласнымі сіламі выраблялі школьную мэблю, абсталяванне, наглядныя дапаможнікі, перапісвалі падручнікі. З'яўляючыся ключавымі фігурамі ў працэсе навучання і выхавання навучэнцаў, настаўнікі выконвалі функцыю распаўсюджвання камуністычнай ідэалогіі і прапаганды.

Працэс аднаўлення і стан школьнай адукацыі Беларусі ў пасляакупацыйныя і пасляваенныя гады знайшлі сваё адлюстраванне ў працах беларускіх даследчыкаў савецкага і постсавецкага перыядаў (Н. М. Ганушчанка, Н. Г. Гнеўка, М. В. Жарскі, І. М. Ільюшын, Р. Я. Кісялёў, М. С. Крот, П. В. Саевіч, С. А. Умрэйка і інш.). Аналіз літаратурных крыніц сведчыць, што навукоўцы ў асноўным засяроджвалі сваю ўвагу на такіх аспектах, як будаўніцтва і рамонт школьных будынкаў і памяшканняў, пашырэнне сеткі школьных устаноў, павелічэнне кантынгенту навучэнцаў, забеспячэнне школ педагагічнымі кадрамі, рэалізацыя ўсянавуча. Такі ж важны аспект, як матэрыяльнае становішча і ўмовы быту настаўнікаў у спецыфічных сацыяльна-эканамічных умовах пасляваеннага часу закранаецца ў працах толькі ўскосна. Гэта дае падставу звярнуцца да больш дэтальнага даследавання ўмоў паўсядзённага жыцця і працы настаўнікаў Беларусі ў пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады.

Асноўная частка. Напярэдадні вайны ў рэспубліцы паспяхова функцыянавала дастаткова разгалінаваная і рацыянальна арганізаваная сістэма агульнай сярэдняй адукацыі. Школы мелі адносна добрую матэрыяльную базу: былі забяспечаны школьнай мэбляй, абсталяванымі спецыяльнымі кабінетамі, вучэбна-наглядным дапаможнікамі, пры кожнай школе функцыянавала бібліятэка [1, арк. 186].

З мэтай павышэння сацыяльнага статусу настаўнікаў кіраўніцтвам савецкай дзяржавы ў 1930-х гг. быў прыняты шэраг пастаноў па сацыяльнай абароне педагогаў за кошт грамадскіх фондаў спажывання, у прыватнасці, аб забеспячэнні настаўнікаў жыллём. Мясцовыя саветы дэпутатаў працоўных абавязаны былі прадастаўляць настаўнікам, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці і рабочых пасёлках, бясплатныя кватэры з ацяпленнем і асвятленнем. Калі такой магчымасці не было, настаўнікі павінны былі забяспечвацца арэндным жылой плошчай. Сродкі па аплаце наёмнай кватэры і за камунальныя паслугі ўключаліся ў рахунак школы [2, с. 461].

Вайна і часовая акупацыя тэрыторыі БССР нанеслі сістэме агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі вялікі матэрыяльны і кадравы ўрон. Існаваўшая ў перадваенныя гады сетка школьных навучальных устаноў практычна была знішчана. Фашысты спалілі і разбурылі 8825 школьных будынкаў разам з абсталяваннем, вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, падручнікамі, бібліятэкамі. Агульныя матэрыяльныя страты, нанесеныя агульнаадукацыйнай школе, склалі 1013,2 млн руб. [3, с. 301].

Пасляакупацыйнае ўзнаўленне дзейнасці агульнаадукацыйных школьных устаноў рэспублікі пачалося восенню 1943 г. у часткова вызваленых раёнах Палескай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Адраджэнне школьнай адукацыі рэспублікі разглядалася партыйна-ўрадавым кіраўніцтвам савецкай дзяржавы як стратэгічная задача ідэалагічнага, гаспадарчага і абарончага значэння. Аб гэтым сведчыць той факт, што 1 студзеня 1944 г., калі яшчэ ішла вайна, СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі сакрэтную пастанову "Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК ВКП(б)Б", якая абавязвала партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі "аднавіць у 1944 г. у вызваленых раёнах сетку пачатковых і сярэдніх школ, ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту" [4, с. 37].

Поспех аднаўлення школьнага навучання ў значнай ступені залежаў ад настаўніцкіх кадраў, іх самаадданай працы ў надзвычай складаных умовах паўсядзённага жыцця і працы.

З пачаткам мірнага жыцця першачарговымі задачамі, якія стаялі перад мясцовымі партыйна-савецкімі органамі, з'яўляліся аднаўленне матэрыяльнай базы школ, пашырэнне сеткі школьных устаноў і забеспячэнне ўсянавуча. Задача забеспячэння настаўнікаў спрыяльнымі ўмовамі для паўсядзённага жыцця і працы аўтаматычна адышла на другі план. Сродкі, якія выдзяляліся па лініі Наркамасветы рэспублікі, у першаю чаргу расходваліся на рамонт школьных будынкаў і аплату працы настаўнікаў. Таму ў пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады школьныя настаўнікі рэспублікі, як і іншыя слаі насельніцтва, перажывалі сур'ёзныя матэрыяльна-бытавыя цяжкасці.

Адной з асноўных праблем, якая істотна стрымлівала аднаўленне дзейнасці школ на вызваленай ад акупацыі тэрыторыі рэспублікі, асабліва ў сельскай мясцовасці, з'яўлялася адсутнасць жылля для настаўнікаў.

Не мелі жылля не толькі маладыя настаўнікі без педагагічнага стажу, але і тыя, хто працаваў у школе не адзін дзясятак гадоў. Як вынікае са справаздачы Мінскага гарана "Аб рабоце школ у першым паўгоддзі 1944/45 навучальнага года", большая частка настаўнікаў вымушана была жыць у гасцініцах, школах, іншых установах [5, арк. 19]. Не лепшай была забяспечанасць настаўнікаў жылой плошчай і ў іншых гарадах рэспублікі. Як правіла, яны жылі ў камунальных кватэрах, арандаваных пакоях, інтэрнатах, бараках.

Складанае становішча існавала і з забеспячэннем жыллём маладых настаўнікаў сельскіх школ. Мясцовыя органы адукацыі не мелі магчымасці выдзеліць ім кватэры і не заўсёды маглі дапамагчы ў вырашэнні многіх бытавых пытанняў. Як правіла, маладыя настаўнікі арандавалі "куты" ў мясцовых жыхароў, жылі ў пакоях пры школьных будынках і нават у зямлянках. Гэта з'яўлялася адной з асноўных прычын звальнення настаўнікаў і спынення работы школ.

Сур'ёзныя цяжкасці ў пасляакупацыйныя гады існавалі і з забеспячэннем настаўнікаў харчовымі прадуктамі, адзеннем і абуткам. У адпаведнасці з картачнай сістэмай, якая была ўведзена ў СССР у ліпені 1941 г., права на гарантаванае прадуктовае забеспячэнне па нормах рабочых прамысловасці, транспарту і сувязі мелі толькі настаўнікі школ буйных гарадоў. Астатнія, згодна з загадам Наркамгандлю СССР ад 31 жніўня 1944 г. за № 418, мелі права на атрыманне толькі 500 грамаў хлеба на дзень [6, арк. 1].

Аднак, як сведчаць архіўныя матэрыялы, патрабаванні адзначаных дакументаў аб забеспячэнні настаўнікаў прадуктамі харчавання выконваліся выключна нездавальняюча. Так, настаўнікі школ Мінска, якія знаходзіліся на гарантаваным прадуктовым забеспячэнні, у першым паўгоддзі 1944/45 навучальнага года атрымлівалі толькі хлеб [5, арк. 19].

Дрэнна былі забяспечаны і настаўнікі сельскіх школ. Пацвярджэннем таму з'яўляюцца вынікі інспектарскай праверкі, праведзенай Наркамасветы рэспублікі ў лістападзе 1944 г. Так, у Ляхавіцкім раёне Баранавіцкай вобласці ў школах працавалі 102 настаўнікі, а хлебныя карткі былі выдадзены толькі 85. Замест 500 грамаў хлеба па картцы адпускалася толькі 180 грамаў мукі. У Стаўбцоўскім раёне хлебныя карткі настаўнікам наогул не выдалі. Не атрымлівалі хлеб і настаўнікі Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. У Пінскай вобласці хлебам забяспечваліся толькі настаўнікі, што прыбылі з партызанскіх атрадаў і эвакуацыі [1, арк. 279]. Многім маладым настаўнікам прыходзілася жыць на ўтрыманні гаспадароў, у якіх яны кватаравалі, за што павінны былі адпрацоўваць, дапамагаючы па гаспадарцы [7, арк. 46].

Складанасці існавалі ў сельскіх настаўнікаў і з атрыманнем выдзеленага хлебнага пайка. Часам, каб забраць хлеб, прыходзілася дабірацца да крамы, якая знаходзілася на адлегласці 3–5 кіламетраў, пешшу.

Акрамя прадуктаў харчавання, вялікай праблемай для настаўнікаў была адсутнасць прыдатных для працы ў школе вопраткі і абутку. Многім было сорамна ў сваім адзенні паказацца ў школе. Як правіла, маладыя настаўніцы хадзілі на працу ў зацыраваных старых сукенках, без панчох, у рваных чаравіках. Асабліва вялікую патрэбу ў адзенні і абутку мелі настаўнікі з ліку былых партызан. Яны не мелі цывільнага адзення і не мелі магчымасці яго набыць. "Раённыя арганізацыі дапамогі ў гэтай справе не аказваюць", – скардзіўся ў Наркамат асветы рэспублікі загадчык Пінскага аблана [5, арк. 149].

Згодна з даведкай, падрыхтаванай інструктарам аддзела школ ЦК КП(б)Б А. Трутневым, настаўнік Машковіцкай школы Бярозаўскага раёна Мазур праводзіў урокі ў залатаным пінжаку і парваных чаравіках. Настаўніца Далгоніцкай школы Сіроцінскага раёна Віцебскай вобласці Аксёнава хадзіла ў школу басанож [7, арк. 45–46].

У Гродзенскай і Віцебскай абласцях па прычыне адсутнасці абутку інспектары райана і аблана не маглі паехаць у камандзіроўку, а настаўнікі – пайсці ў школу на працу [1, арк. 279].

Адзенне настаўніка ставіла яго ў няёмкае становішча перад навучэнцамі і іх бацькамі.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва рэспублікі імкнулася мінімізаваць праблему забеспячэння настаўнікаў прыдатнымі для працы вопраткай і абуткам. Кіруючыся распараджэннем СНК

СССР “Аб аднаразовым водпуску мэтавым прызначэннем адзення, абутку і іншых прамысловых тавараў для настаўнікаў”, Саўнаркам БССР у лютым 1944 г. звярнуўся з хадайніцтвам да саюзнага ўрада аб выдзяленні для настаўнікаў спецыяльных фондаў мануфактуры і абутку. Аднак гэта хадайніцтва не было задаволена [8, арк. 315]. У маі таго ж года Наркам асветы Е. І. Уралава звярнулася цяпер ужо да ЦК КП(б)Б з просьбай: “Улічваючы вострую патрэбу ў адзенні і абутку, прашу ўзбудзіць хадайніцтва перад ЦК ВКП(б) аб водпуску для 7000 настаўнікаў мэтавым прызначэннем мануфактуры і абутку” [8, арк. 315].

Адным з вызначальных фактараў матэрыяльнага дабрабыту настаўнікаў у пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады была заработная плата, якая фарміравала асноўную крыніцу даходаў гэтай катэгорыі насельніцтва. У цэлым, у залежнасці ад узроўню адукацыі, стажу і педагагічнай нагрузкі яна складала 350–600 руб. у месяц, прычым настаўнікі школ сельскай мясцовасці атрымлівалі на 25–75 руб. менш, чым настаўнікі гарадоў і рабочых пасёлкаў.

Паколькі дзяржаўныя цэны на прадукты харчавання і прамысловыя тавары былі дастаткова высокімі, педагогі на свой заробак не маглі належным чынам забяспечыць сябе і сваю сям’ю нават самым неабходным.

Фактычна ў пасляакупацыйныя гады прафесія настаўніка ў большай ступені асацыіравалася з самааддачай, а не з дастойным заробкам.

З мэтай паляпшэння ўмоў паўсядзённага жыцця і працы настаўнікаў СНК БССР і ЦК КП(б)Б 5 снежня 1944 г. прынялі пастанову “Аб матэрыяльным забеспячэнні настаўнікаў”. Дакумент прадугледжваў выдзяленне настаўнікам прадуктовых пайкоў, забеспячэнне прамысловымі таварамі, жыллём, зямельнымі ўчасткамі для прысядзібнай гаспадаркі, ацяпленнем і асвятленнем. Паводле ўстаноўленых нормаў настаўнік, акрамя хлеба, меў магчымасць атрымаць 600 грамаў цукру ў квартал, чай, соль па 400 грамаў у месяц, гаспадарчае мыла па 400 грамаў у квартал і запалкі. Вопраткай і абуткам настаўнікі павінны былі забяспечвацца мэтавым прызначэннем [6, арк. 1].

Аднак, як вынікае з архіўных крыніц, пасля прыняцця пастановы істотных станоўчых змен у матэрыяльна-бытавым забеспячэнні педагагічных работнікаў рэспублікі не адбылося. Паўсюдна настаўнікі сутыкаліся з парушэннямі ў парадку выдачы заработнай платы, забеспячэннем прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. Адной з прычын такога становішча з’яўлялася адсутнасць належнага клопату аб дабрабыце настаўнікаў з боку мясцовых партыйных і савецкіх органаў [7, арк. 45–46]. Так, Пінскі абкам КП(б)Б і аблвыканкам нават не абмеркавалі пастанову СНК БССР і ЦК КП(б)Б [7, арк. 65].

Як і раней, выключна вострым заставалася пытанне забеспячэння настаўнікаў жыллём. Так, у даведцы “Аб падрыхтоўцы школ г. Мінска да пачатку 1945/46 навучальнага года” адзначалася: “Пытанне з забеспячэннем настаўнікаў жылой плошчай не вырашана” [5, арк. 63]. У Брэсце жылля не мелі 11 настаўнікаў, у Пружанах – 8 [9, арк. 247]. Не мелі кватэр настаўнікі школ Гомеля, Рэчыцы [9, арк. 218]. У іншых гарадах забеспячэнне настаўнікаў жылой плошчай было не лепшым.

Калі ў гарадах праблема забеспячэння педагогаў жыллём у некаторай ступені паступова вырашалася, то ў сельскай мясцовасці яна заставалася катастрафічна вострай. Па прычыне адсутнасці неабходнага жыллёвага фонду мясцовыя ўлады не маглі забяспечыць настаўнікаў жылплошчай. У выніку большая частка сельскіх настаўнікаў рэспублікі ў 1945/46 навучальным годзе не была забяспечана кватэрамі [10, арк. 86]. “Пастанова партыі і ўрада аб выдзяленні настаўнікам сельскай мясцовасці бясплатнай кватэры і ацяплення поўнасцю не выконваецца”, – адзначалася ў справаздачы аддзела школ Маладзечанскага абкама КП(б)Б. З 1975 настаўнікаў вобласці толькі 692 жылі ва ўласных дамах, 587 мелі кватэры ў школьных будынках, 107 пражывалі ў камунальных кватэрах і 589 жылі ў прыватных кватэрах [11, арк. 57].

Настаўнікі Гершанскай сямігадовай школы Брэсцкага раёна штодня хадзілі начаваць за 7 км у Брэст [9, арк. 247].

Распаўсюджанай з’явай была несвоечасовая выплата грашовай кампенсацыі настаўнікам, якія жылі на кватэрах у мясцовых жыхароў [10, арк. 66]. У шэрагу школ Уздзенскага, Бярэзінскага, Плешчаніцкага раёнаў Мінскай вобласці запазычанасць па квартплаце дасягала 6–7 месяцаў

[10, арк. 86]. Дадзеная сітуацыя тлумачылася адсутнасцю і абмежаванасцю бюджэтных асігнаванняў.

Адным са шляхоў паляпшэння жыллёвых умоў настаўнікаў сельскіх школ павінна было стаць індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Аднак яго стрымлівалі абмежаванасць дзяржаўных пазык і дэфіцыт будаўнічых матэрыялаў [11, арк. 57].

Трэба адзначыць, што ў грамадскай свядомасці, асабліва ў сельскай мясцовасці, прафесія настаўніка ацэньвалася даволі высока. Аб гэтым сведчыць імкненне насельніцтва ўсіх рэгіёнаў рэспублікі палепшыць жыллёвыя ўмовы настаўнікаў. Пацвярджэннем з'яўляецца той факт, што летам 1945 г. у працэсе падрыхтоўкі да 1945/46 навучальнага года сіламі насельніцтва ў Пінскай вобласці было адрамантавана 117 кватэр для настаўнікаў [11, арк. 34].

Нездавальняюча выконвалася і патрабаванне партыйна-ўрадавай пастановы аб забеспячэнні настаўнікаў прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. На 1 верасня 1945 г. у школах рэспублікі працавала 41700 настаўнікаў. З іх у гарадах – 7000, у сельскіх школах – 34700 чалавек. На гарантаванае забеспячэнне па нормах рабочых прамысловасці, транспарту і сувязі былі прыняты толькі настаўнікі абласных цэнтраў – 3900 чалавек. Астатнія мелі права на забеспячэнне па нормах у адпаведнасці з пастановай СНК БССР і ЦК КП (б)Б "Аб матэрыяльным забеспячэнні настаўнікаў" [6, арк. 1].

Трэба адзначыць, што ўлады многіх раёнаў не надавалі належнай увагі кантролю за працэсам матэрыяльнага забеспячэння настаўнікаў [11, арк. 89]. У выніку частымі былі разбазарванне і крадзёж прызначаных для настаўнікаў тавараў. Больш таго, мелі месца шматлікія факты пераразмеркавання прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў іншым асобам сакратарамі райкамаў і старшынямі райвыканкамаў [9, арк. 265–266].

Пры адсутнасці кантролю з боку ўлад абласныя і раённыя спажыўсаюзы, спасылаючыся на пастанову ўрада аб праве мясцовых органаў змяняць нормы забеспячэння, адвольна іх зніжалі. І нават гэта выдавалася нерэгулярна [7, арк. 45]. Аб дрэнным забеспячэнні прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі сведчаць шматлікія лісты настаўнікаў са скаргамі, якія паступалі ў аддзел школ ЦК ВКП(б)Б, Наркамасветы з усіх абласцей рэспублікі [6, арк. 1]. Праверкай, праведзенай Мінскім аблана, было ўстаноўлена, што факты нездавальняючага забеспячэння настаўнікаў мелі месца ва ўсіх раёнах. У прыватнасці, несвоечасова атрымлівалі хлебны паёк настаўнікі Барысаўскага раёна, а настаўнікі Вяляцкага, Зачысцкага, Бытчанскага сельсаветаў гэтага раёна наогул не забяспечваліся хлебам, прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. Настаўнікі горада Барысава, згодна з планам размеркавання, павінны былі атрымаць прамтавараў на 16000 руб., аднак іх яны так і не атрымалі. Не атрымалі прамысловых тавараў і настаўнікі горада Мінска. У Заслаўскім раёне хлебны паёк настаўнікам быў выдадзены толькі пасля ўмяшання раённага пракурора [5, арк. 56].

Фонды мануфактуры, якая выдзялялася для настаўнікаў дзяржавай мэтавым прызначэннем, былі нязначнымі. Яны ні ў якім разе не вырашалі існуючую праблему забеспячэння настаўнікаў прыдатным для педагагічнай працы адзеннем і абуткам [6, арк. 1]. Набыць жа іх па камерцыйных коштах, якія былі ў шмат разоў вышэйшыя за пайковыя, педагогі не мелі магчымасці па прычыне невысокіх заробкаў. Звычайна ў гардэробе школьных настаўнікаў быў адзін камплект адзення, пераважна цёмнага колеру, сціплы і дастаткова стандартны.

Адсутнасць жылля, складаныя ўмовы працы, дрэннае забеспячэнне прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі, нізкія заробкі з'яўляліся прычынамі высокай цякучасці педагагічных кадраў.

Каб палепшыць матэрыяльна-бытавое становішча настаўніцкіх кадраў, зрабіць іх працу больш прывабнай, а грамадскі статус больш годным, Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б 6 лютага 1946 г. прынялі пастанову "Аб мерах па бытавым уладкаванні настаўнікаў і паляпшэнні іх забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі" [10, арк. 66]. Пастанова прадугледжвала сацыяльную падтрымку школьных настаўнікаў па наступных напрамках: паляпшэнне жыллёвых умоў, забеспячэнне харчовымі і прамысловымі таварамі, выдзяленне ўчасткаў пад агароды ў сельскай мясцовасці і інш.

Урадава-партыйная дырэктыва была абмеркавана абкамамі КП(б)Б і выканкамамі абласных Саветаў рэспублікі. У прынятых пастановах, як правіла, адзначаліся нераспарадчасць мясцовых

органаў, іх нядбайнасць і няўвага да праблем настаўнікаў, прадпісвалася неадкладна прыступіць да выканання задач па паляпшэнні ўмоў паўсядзённага жыцця і працы педагагічных кадраў.

Аднак мясцовыя ўлады, як і раней, не надавалі належнай увагі матэрыяльна-бытавому становішчу настаўнікаў. Так, у Полацкай вобласці да пачатку 1946/47 навучальнага года пастанову Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 6 лютага 1946 г. “Аб мерах па бытавым уладкаванні настаўнікаў і паляпшэнні іх забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі” з 15 райкамаў і гаркамаў КП(б)Б абмеркавалі на сваіх пасяджэннях толькі два: Ветрынскі і Плісскі [10, арк. 68].

На практыцы многія загады, дырэктывы і законы, якія датычыліся матэрыяльна-бытавога становішча настаўнікаў, мясцовымі ўладамі, фінансавымі аддзеламі шэрагу выканкамаў і гандлюючымі арганізацыямі на месцах не выконваліся. Менавіта таму ўмовы паўсядзённага жыцця і працы настаўнікаў рэспублікі кардынальна не палепшыліся.

Аб гэтым сведчыць прыклад Полацкай вобласці. Нават на пачатак 1946/47 навучальнага года ў вобласці 30 настаўнікаў працягвалі жыць у зямлянках. Як і раней, па прычыне адсутнасці грошай на рахунках раённых фінансавых аддзелаў выплата кватэрных рабілася несвоечасова [10, арк. 66].

У шэрагу раёнаў вобласці (Браслаўскі, Відзаўскі, Дрысненскі, Асвейскі, Расонскі) парушаўся ўстаноўлены парадак забеспячэння настаўнікаў прамысловымі таварамі. У Расонскім і Асвейскім раёнах замест хлеба настаўнікі атрымлівалі зерне. У Браслаўскім раёне настаўнікі не атрымлівалі ніякіх харчоў, акрамя хлеба, забеспячэнне якім адбывалася з перабоямі [10, арк. 67].

У раёнах вобласці мела месца несвоечасовая выплата заработнай платы (Ветрынскі, Докшыцкі, Дрысенскі, Глыбоцкі, Плісскі). Запазычанасць настаўнікам па аплаце за студзень, люты, сакавік 1946 г. склала 354,3 тыс. руб. Па прычыне адсутнасці грашовых знакаў у дзяржбанку не былі выдадзены своечасова зарплата за чэрвень і адпускныя ў памеры 1574,3 тыс. руб. [10, арк. 68].

Істотна не палепшыліся матэрыяльна-бытавыя ўмовы настаўнікаў і ў Мінскай вобласці. На пачатак 1946/47 навучальнага года настаўнікі ў большасці школ не былі забяспечаны бясплатнымі кватэрамі. У многіх раёнах меліся затрымкі з выплатай квартплаты. У школах Уздзенскага раёна запазычанасць па квартплаце дасягала 6–7 месяцаў. Як і раней, мелі месца перабоі з забеспячэннем настаўнікаў прадуктамі харчавання. У школах Уздзенскага і Бярэзінскага раёнаў настаўнікі па 2–3 мясяцы не артымлівалі хлебнага пайка. Квартальны паёк на іншыя прадукты і прамысловыя тавары таксама выдаваўся несвоечасова [10, арк. 86].

Заключэнне. Такім чынам, з’яўляючыся часткай інтэлігенцыі, якой вышэйшае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва адводзіла асаблівую ролю ў грамадстве, настаўнікі Беларусі ў пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады знаходзіліся ў вельмі складаных умовах у паўсядзённым жыцці і працы. Нягледзячы на тое, што савецкая ўлада шматлікімі пастановамі дэкларавала клопат пра матэрыяльнае становішча педагогаў, у тым ліку па жыллі і заробках, іх паўсядзённы быт, як вынікае з архіўных крыніц, быў выключна складаным: адсутнасць спрыяльных жыллёвых і элементарных бытавых умоў, нізкая і несвоечасовая выплата заработнай платы, нездавальняючае забеспячэнне харчовымі і прамысловымі таварамі. Гэта ў значнай ступені тлумачыцца тым, што ва ўмовах разрухі, голаду, недахопу фінансавання і матэрыяльных рэсурсаў мясцовыя органы кіравання выконвалі патрабаванні прынятых пастаноў па паляпшэнні матэрыяльных умоў настаўнікаў не ў поўным аб’ёме ці са значнай адтэрміноўкай.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 21.

2. Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа: сб. док., 1917–1973 г.г. / сост.: А. А. Абакумов [и др.]. – М.: Педагогика, 1974. – 559 с.

3. Экономика Советской Белоруссии, 1917–1967 / Акад. наук БССР, Ин-т экономики; отв. ред. Ф. С. Мартинкевич. – Мн.: Наука и техника, 1967. – 571 с.

4. Освобожденная Беларусь: док. и материалы: в 2 кн. / Ком. по арх. и делопроизводству при Совете Министров Респ. Беларусь [и др.]; сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Мн.: НАРБ, 2004. – Кн. 1: Сентябрь 1943 – декабрь 1944. – 398 с.

5. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 30.

6. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 43.

7. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 28.

8. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 29.
9. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 27.
10. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 38.
11. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 41.

References

1. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 21 (in Belarusian).
2. Abakumov A. A., Kuzin N. P., Puzyrev F. I., Litvinov L. F. (comp.). Public education in the USSR. Comprehensive school: collection of documents, 1917–1973. Moscow, Pedagogika Publ., 1974. 559 p. (in Russian).
3. Martinkevich F. S. (ed.). Economy of Soviet Belarus, 1917–1967. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1967. 571 p. (in Russian).
4. Adamushko V. I., Bondarenko N. A., Knat'ko G. D., Selemenev V. D. (comp.). Liberated Belarus: documents and materials. Book 1. September 1943 – December 1944. Minsk, National Archives of the Republic of Belarus, 2004. 398 p. (in Russian).
5. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 30 (in Belarusian).
6. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 43 (in Belarusian).
7. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 28 (in Belarusian).
8. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 29 (in Belarusian).
9. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 27 (in Belarusian).
10. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 38 (in Belarusian).
11. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 41 (in Belarusian).

Информация об авторе

Андарало Игорь Александрович – кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин. Белорусский государственный университет культуры и искусств (ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: aia1106@mail.ru

Information about the author

Ihor A. Andaralo – Ph. D. (Pedagog.), Associate Professor, Associate Professor of the Department of cultural studies and psychological-pedagogical sciences. Belarysian State University of Cultyre and Arts (17 Rabkorovskaya Str., Minsk 220007, Belarus). E-mail: aia1106@mail.ru